1269/Б2.

Яго Міласьці

НАЧАЛЬНІКУ ПОЛЬСКАГА ГАСПАДАРСТВА

ад Цэнтральнае Беларускае Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны

# Дэклярацыя.

Цэнтральная Беларуская Рада Віленшчыны і Горадзеншчыны, выбраная селета у Вільні 12-го Чэрвеня на Беларускім Зьездзе, які горача прывітау Вашую адозву аб аднауленьні Беларуска-Літоускае дзяржавы з колішніх зямель т.зв. Вялікага Княжства Літоускага - з поунай верою у шчырасьць Вашых слоу, зварочуецца да Вас, як зьведанага правадыра Польскае дэмакратыі, каб Вы з усей ад Вас залежнай сілаю прычыніліся да рэальнага будауніцтва беларускае дзяржаунасьці, узялі-б на сябе адваяваньне і згуртаваньне Беларускае Зямлі і абаранілі-б незалежнасьць і непадзельнасьць беларускага народу ад анэксыэністычных напасьцяу з якое-б ні было стараны.

Прызнаньне беларускаму народу правоу на незалежнае быцьце і падтрыманьне іх польскай дэмакратыяй для абодвух народау прынясе толькі карысьць, бо паложыць цьверды фундамэнт для будучага згоднага жыцьця і прыязнага зближэньня.

Разьвіваючы далей пастановы Зьезду, які узлажыу на Раду абавязак арганізацыі беларускага нацыянальнага войска, Рада зварочуецца да Вашае Міласьці з просьбаю падтрымаць стварэньне збройнае сілы, як вядомага знаку мкненьня беларускага народу да вольнага і незалежнага жыцьця.

З свае стараны Рада лічыць магчымым тварэньне беларускага войска на такіх асновах:

I. Беларускае Рада Віленшчыны і Горадзеншчыны выдзяляе Вайсковую Камісію з мейсцам быцьця пры Галоуным Камандаваньні Польскага Войска. Апрача гэтага, Камісія будзе мець сваіх прадстаунікоу ува усіх галінах вайсковае гаспадаркі, што будуць датычыць беларускага войска і у Комэндатуры Беларускага войска.

Галоуны Камандуючы Польскага Войска Назначае Начальніка Беларускага Войска і афіцэрау з асабовага лісту падаванага Беларускай Вайсковай Камісіяй, што не выключае назначэньня афіцэрау беспасрэдна

PIŁSUDSKI INSTITUTE ARCHIVES New York

Галоуным Камандуючым Польскага Войска, аднак толькі за згодай Камісіі. Гэтакім жа парадкам адбываецца і выдаленьне з беларускага войска.

2. Камісія кіруе нацыянальным гадаваньнем Беларускага Войска і концэнтруе усялякую працу, што датыча падмогі беларускаму салдату беларускім грамадзянствам.

3. Беларуская Вайсковая Камісія разам з Галоунаю Польскаю Камандаю устанауляе форму Беларускага войска.

4. Беларуская Вайсковая Камісія безадкладна назначае Камісію дзеля апрацаваньня статутау службы. У склад яе уваходзяць так сама афіцэры спэцыялісты назначаныя Галоуным Камандаваньнем Польскага Войска.

5. Беларускае Войска можа толькі ваяваць на беларускім фронце і ня можа быць выводжана з тэрыторыі Беларусі.-

СТАРШЫНЯ РАДЫ Б. Тарашкевіч

Цэнтральная Рада Віленшчыны і Гродзеншчыны * Centralnaja Rada Wilenščyny i Hrodzienščyny

Сэкрэтар [signature]

DOWÓDZTWO WOJSK POLSKICH
ADJUTANTURA GENERALNA
WARSZAWA
L. Dz. 1269/92 dnia 14 VIII 1919
załącz. Wydz.

1269/32

ODPIS.

Jago Miłasci

NACZALNIKU POLSKAGO GOSPODARSTWA

ad Centralnaje Beiłaruskoje Rady Wilenszczyny i Goradzenszczyny.

# DEKLARACJA.

Cientralnaja Biełaruskaja Rada Wilenszczyny i Goradzenszczyny, wybrannaja ca̶ł̶ bieta u Wilni 12-go Czerwenia na Biełaruskim Ziezdie, jaki goracza priwitau Waszuju adozwu ab adnaulennji Biełaruska-Litouskae diarżawy z kolisznich ziamiel t. zw. Wialikago Kniażestwa Litouskago - z pounoj bieraju u szczyrasć Waszich słou, zwaruczujecca da Was, jak zwedanago prawadyra Polskaje demakracji, kab Wy z usiej ad Was załażenaj siłaju priczynilisia da realnago budaunictwa biełaruskajeł diarżaunascie, uziali-b niezależnasć i niepadzielnasć biełaruskago Narodu ad aneksyenistycznych napasciau z jakoje-b ni było starany.

Priznanie biełaruskomu narodu prawau na niezależnaje byccie i padtrymannie ich polskaj demakratyaj dla abodwuch narodau priniasie tolki karysć, bo pałożyć cwierdy fundament dla buduczago zgodnago życcia i prijaznago zbliżennia.

Razwiwajuczy dalej pastanowy Zjezdy, jaki uzłażyu na Rady abawiazak arganizacji biełaruskago nacyjalnago wojska, Rada zwaroczujecca do Waszaje Miłasci z prosbaju padtrymac stwarennie zbrojnaje siły, jak wiadomago znaku mknieннia biełaruskago narodu da wolnago i niezależnago życcia.

Z swaje starany Pada liczyc magczymym twarennie biełaruskago wojska na takich asnowach:

1. Biełaruskaja Rada Wilenszczyny i Garadzenszczyny wydziałaje Wajskowuju Kamisju z miejscami byccia pry Gałaunym Kamandawanni Polsgao Wojska. Apracza getago, Kamisja budze miec swaich pradstaunikau uwa usich galinach wajskowaje gaspadarki, szto buduc datyczyc biełaruskago wojska i u Komendatury Biełaruskago wojska.

Gałouny Kamandujuczy Polskago Wojska naznaczaje Naczalnika Biełaruskago wojska i aficerau z asabowago listu padawanago Biełaruskaj Wajskowaj Kamissji, szto nie wykluczaje naznaczenja aficerau bezpasredna Gałounym Kamandajuczym Polskago Wojska, adnak tolki za zgodaj Kamissji. Getakim ża paradkam adbywajecca i wydalennie z biełaruskago wojska.

2. Kamisja kiruje nacyjalnymi gadawanniem Biełaruskago Wojska i koncentruje usialakuju pracu, szto datycza padmogi biełaruskomu całdatu biełaruskim gramadzianstwam.

3. Biełaruskaja Wajskowaja Komisja razam z Gałounaju Polskaju Kamandaju ustanaulaje formu Biełaruskago wojska.

4. Biełaruskaja Wajskowaja Komisja biezadkładna naznaczaje Kamisju dzela apracawannia statutau służby. U skład aje uwachodziac tak sama aficery cpecyalisty naznaczanyja Gałounym Kamandywanjem Polskago Wojska.

5. Biełaruskaje Wojska może tolki wyjawiac na biełaruskim froncie i nia moża byc wywodżana z terytoryi Biełarusi.

STARSZYNIA RADY Taraszkiewicz m.p.

SEKRETAR: / podpis nieczytelny/

Za zgodność odpisu:

PILSUDSKI INSTITUTE ARCHIVES New York

77